Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 24 (324)

■ Акцыі

## РАЗВІТАННЕ З ТЫСЯЧАЙ

### Незвычайная акцыя пройдзе заўтра, 26 чэрвеня, у Нацыянальным мастацкім музеі

Дэнамінацыя беларускага рубля — справа не толькі эканамічная. Цягам 17 гадоў выява будынка Нацыянальнага мастацкага музея ўпрыгожвала купюру старога ўзору наміналам у тысячу рублёў. Таму супрацоўнікі ўстановы вырашылі зладзіць сімвалічнае развітанне — акцыю «Тысяча, бывай!».

Цягам усяго дня кошт уваходнага білета на экспазіцыю мастацкага музея складзе... усяго 1 000 рублёў. Так, пабачыць шэдэўры з фондаў музея і ўсе часовыя выстаўкі ў гэты дзень можна будзе амаль бясплатна. Таксама адбудзецца ўрачыстая цырымонія падпісання купюры наміналам у 1 000 рублёў генеральным дырэктарам музея Уладзімірам Пракапцовым і перадача гэтага ўжо амаль гістарычнага прадмета ў музейны архіў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# ПА СЛЯДАХ ВАВІЛОНСКАЙ ВЕЖЫ,



Фота www.agt.by

# або СКУЛЬПТУРЫ НАСТУПАЮЦЬ

**Адна з самых маштабных вулічных інсталяцый лета, якая знаёміла нас мінулы раз з жалезным хакеістам і вялізнай вежай з біблейскага падання, зноў адкрылася на тэрыторыі Камсамольскага вострава ў парку Перамогі — знакамітыя «Арт-астравы». Гэта не проста вернісаж пад адкрытым небам, а цэлы мастацкі маршрут. За кожным паваротам сцяжынкі — новы сімвалічны аб'ект, вельмі філасофскі, часта пададзены з іроніяй альбо гумарам, але заўсёды поўны эмоцый. Ад дызайнерскіх задумак да трэш-арту. Мастацкія работы сталі часткай гарадскога асяроддзя, збіваючы яго афіцыяльнасць і штодзённасць, дадаючы крэатыўнасці. Гэта ўжо адна з устойлівых тэндэнцый сучаснага беларускага мастацтва. Магчыма, вы будзеце шакаваныя. Але дакладна здзівіцеся. Запомніце: гэта public art, а не акадэмічная манументальная скульптура.**

Намеснік старшыні Саюза беларускіх мастакоў Леанід Хобатаў адзначыў на адкрыцці праекта, што пляцоўка арт-астравоў – гэта не толькі эстэтыка, тут пастаўлены сур'ёзныя пытанні прасторы, пластыкі, стылістыкі і інтэлектуальнай думкі. У творчым «сусвеце» зразумела.

Пятнаццаць аб'ектаў у некалькі метраў з самых розных матэрыялаў – металу, дрэва, пластыку. Свабода ў формах і колерах, поўны эксперымент, нацыянальны авангард. На востраве прадстаўлены самыя незвычайныя з'явы (а можа і звычайныя, але ў арыгінальнай акантоўцы). Чырвоны партал з камянямі, які вядзе на парог вечнасці, белыя коканы на дрэвах, нібыта з логава гіганцкага павука, драўляны веласіпед з трыма коламі, які нагадвае гаўбіцу, каляровыя цені, што танцуюць, дрэва-лега, якое прырасло да ствала сасны, квэст з дарожных знакаў...

Дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучаснага мастацтва Наталля Шаранговіч прызналася, што ўсіх мастакоў наўмысна выбіралі па прынцыпе «яны павінны быць вельмі рознымі». Сярод скульптараў і дызайнераў, творамі якіх можна палюбавацца – Дзмітрый Сурскі, Канстанцін Селіханаў і Павел Вайніцкі, Алена Атрашкевіч-Златковіч, Віктар Копач і Максім Пятруль. Прадставілі свае творчыя выказванні Канстанцін Мужаў, Сяргей Аганаў, Вольга Нячай, а таксама Ігар Лявонцьеў і Таццяна Гомза. Не засталіся ў баку Віктар Старухін, Аляксей Сарокін, Аляксандр Сакалоў, Васіль Цімашоў, Паліна Пірагова.

Адзін з удзельнікаў, скульптар Іван Арцімовіч параўнаў мінскія «Арт-астравы» са швейцарскім опэн-эйрам, адным з самых буйных у Еўропе, дзе скульптура таксама надзвычай удала інтэгравалася ў архітэктурнае і прыроднае асяроддзе. «Спадзяюся, Мінск усё ж атрымае свой маштабны парк скульптур, якімі будзе дзейнічаць на пастаяннай аснове, а «Арт-астравы» пашыраць свой фармат да міжнароднага». У праекце сёлета бярэ ўдзел польскі мастак Рэмігіуш Дулька, што прадставіў скульптуру «Горад».

Праект «Арт-астравы» з'яўляецца выдатным прыкладам таго, як паркавая зона ператвараецца не проста ў месца адпачынку, а ў культурную пляцоўку. Аб'екты так ці інакш прымушаюць спыніцца.

Арганізатар выставы – Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў. Праходзіць яна пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. Спонсарам выступіў «Альфа-Банк» (Беларусь). Між іншым, Альфа-прышчэпка ад банка, выстаўленая мінулы раз, ужо стала вай-фай лаўкай побач з Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў на вуліцы Някрасава, 3. Такі ж лёс угатаваны новаму аб'екту ад спонсараў – чырвонаму ветразю. Тры месяцы наведванняў даступныя ў любы час дня і ночы – гэта абавязкова трэба ўбачыць.

**Марыя ВОЙЦІК.**